Будзе свята!

# НАВАГОДНІ НАСТРОЙ У ЗАЛЕ ЧАКАННЯ

**Беларуская чыгунка ўпрыгожыць буйныя вакзалы краіны да калядных і навагодніх свят. Да іх ужо змяніўся чыгуначны вакзал станцыі Мінск-Пасажырскі. Пры афармленні залаў выкарыстоўваліся гірлянды ў чырвона-залатой і сіне-сярэбранай каляровай гаме. Навінкай гэтага года сталі пухнатыя ялінкі з фібраоптыкай, устаноўленыя паміж эскалатарамі.**

На трэцім паверсе будынка традыцыйна размясцілася тэматычная фотазона. Гэтым разам госці і жыхары сталіцы змогуць папоўніць свой сямейны альбом фатаграфіямі на фоне «Палярнага экспрэса» ў кампаніі эльфаў. На стварэнне такой інсталяцыі работнікаў беларускай магістралі натхніла казка Крыса Ван Олсбурга пра маленькага хлопчыка, які не верыў у цуды і напярэдадні Калядаў адправіўся на казачным цягніку да Паўночнага полюса, каб асабіста пераканацца ў існаванні Санта-Клаўса, расказалі падрабязнасці ўзнікнення ідэі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі. Дарэчы, фотазона ў выглядзе казачнай платформы 9 3/4 з вядомай кінасагі Джоан Роўлінг пра Гары Потэра, устаноўленая на вакзале станцыі Мінск-Пасажырскі, летась карысталася ў пасажыраў магістралі асаблівай папулярнасцю.

Акрамя таго, на Прывакзальнай плошчы ў асяроддзі снегавікоў, якія свецяцца, вырасла навагодняя ёлка. Яна выкананая са штучнага матэрыялу, упрыгожана 2,5 тысячы шароў рознага дыяметра, сняжынкамі, званочкамі і светлавымі фігурамі анёлаў, а таксама 1,5-кіламетровай гірляндай. Дарэчы, галоўная чыгуначная ёлка кожны год радуе новым дызайнам.

Упрыгожваць чыгуначныя вакзалы пачалі таксама ў Баранавічах, Брэсце, Віцебску, Гомелі, Магілёве і іншых гарадах краіны. Плануецца, што да сярэдзіны снежня яны ўсе заззяюць святочнымі агнямі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**